# Ідэалогія фашызму не мае права на існаванне

- **Аўтар:**
- **Ірына Прымак**

**У сталічным кінатэатры «Перамога», як і па ўсёй нашай краіне, адбылася вялікая прэм’ера: нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» прадставіла дылогію аб генацыдзе беларускага народа. Яна здымалася на працягу двух гадоў у шчыльным кантакце з Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь, па ініцыятыве якой і з’явіліся гэтыя карціны. Яны змяшчаюць унікальныя архіўныя кадры, успаміны сведкаў, каментарыі спікераў. Перад праглядам усім жадаючым прапаноўвалі пакаштаваць «лагерны» хлеб з вадой, пазнаёміцца з выстаўкай Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, прысвечанай тэме генацыду і гісторыі стварэння фільмаў «Лагеры смерці» і «Спаленыя вёскі».**

Паказ пакінуў вялікія ўражанні ў першых гледачоў, сярод якіх быў і **віцэ-прэм’ер Уладзімір Каранік.**

— Глядзець было маральна цяжка, хоць мае нервы натрэніраваныя хірургіяй, — падзяліўся ён. — Адна справа, калі ты пра гэтыя жахі чытаеш, іншае — бачыць архіўныя матэрыялы, глядзець на целы замучаных жанчын, старых, на смерці дзяцей... Старэйшае пакаленне мне перадало праўду аб Вялікай Айчыннай вайне, штосьці ведаю па родзе сваёй дзейнасці. Але, калі я гляджу на вочы цяперашняй моладзі, разумею, што для яе гэта — шок. У мяне пасля прагляду першая думка: мы доўга маўчалі, і вельмі правільна, што мы нарэшце загаварылі, бо важна даносіць праўду аб нашай перамозе і якой цаной яна дасталася беларускаму народу. Гэта — гарантыя таго, што тыя падзеі ніколі не паўтарацца.

Лічу непрымальнай тую ідэалогію, якая прымала такія страшэнныя антычалавечыя формы. Яна не мае права на існаванне. Таму ўсе спробы яе рэабілітаваць, неяк абяліць, натуральна, выклікаюць абсалютнае непрыманне ў кожнага разумнага чалавека.

На думку віцэ-прэм’ера, гэтыя фільмы важна паглядзець кожнаму беларусу. А яшчэ зрабіць усё магчымае, каб данесці праўду пра вайну і замежнаму гледачу таксама.

Прысутнічалі на прэм’еры і блізкія вядомага беларускага рэжысёра Аляксандра Анісімава, які і зняў гэту дылогію (на фінальным этапе карціну дапрацоўваў Уладзімір Луцкі з-за раптоўнай смерці свайго калегі). «Вядома, гэтыя фільмы глядзець вельмі няпроста. Не толькі таму, што бацька іх не змог завяршыць, але і таму, што разумееш, наколькі ў людзей не было выбару, не было нармальнага жыцця. Нават цяжка ўявіць сябе на месцы тых людзей, бо гэта не ўкладваецца ў галаве наогул», — гаворыць сын Аляксандра Анісімава Глеб.

**Кацярына Акрутная, вядучы бібліёграф аддзела апрацоўкі дакументаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**, ужо некалькі гадоў па родзе сваёй працы мае дачыненне да вывучэння тэмы генацыду беларускага народа, таму не магла абмінуць такую прэм’еру. «Гэтыя фільмы — вялікі ўнёсак у захаванне нашай памяці, і такога кіно павінна быць яшчэ больш, — кажа яна. — Інфармацыі пра вайну многа,

але, каб не заблытацца ў ёй і атрымліваць сапраўды праўдзівую інфармацыю, важна чуць яе ад сведак эпохі».

**Ірына ПРЫМАК**